(2000) очень напоминал «Покахонтас» компании Диснея, в то время как первый китайский 3-D мультфильм «Тигренок Банбан» (2001) был смоделирован так же, как «История игрушек» и др. [2, с. 280]

В этом контексте вклад «Короля обезьян» в развитие китайской анимации становится еще более значительным. Он продемонстрировал перспективу развития китайской мультипликации: то, что необходимо принять и признать местную культуру источником вдохновения для создания фильмов, активно искать точки равновесия между элементами китайской художественной культуры и западным мультипликационным искусством. Кроме этого, в китайских мультфильмах необходимо не только уделять особое внимание внутреннему миру детей, активно показывать «взрослый мир» в их душе, но и принимать во внимание «детскую психологию» взрослых. Возможность успешного соединения одного и второго определит, сможет ли в ходе будущего развития китайская мультипликация встать на путь благоприятного развития.

В «Короле обезьян» была продемонстрирована колоссальная сила художественного воздействия, которая свидетельствует о том, что китайская мультипликация по-прежнему обладает огромным потенциалом для развития. Хочется верить, что при неустанных стараниях мастеров анимации в будущем в китайских мультфильмах удастся еще более удачно сочетать классическую китайскую традицию с лучшими достижениями мирового искусства и вывести китайскую мультипликацию на новый уровень развития.

**Список литературы:**

1. Jing, Ji. Monkey King Rules / Ji Jing // Beijing Review [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.bjreview.com.cn/culture/txt/2015-08/24/content_701208.htm. – Дата доступа : 14.03.2017.
2. Keane, Michael. Handbook of Cultural and Creative Industries in China / Michael Keane. – Cheltenham : Edward Elgar Publishing, 2016. – 576 p.

*Яўген Лойка*

## ПРАЕКТ СВЯТА-КОМПЛЕКСА «СВЯТОЧНАЕ КОЛА БЕЛАРУСАЎ

*Аўтар артыкула апісвае праект па стварэнні масавага святочнага формаўтварэння з выкарыстаннем рэканструкцый, рэстаўрацый і трансфармацый народных абрадаў, якое ў поўнай меры дэманструе прыгажосць традыцыйнай святочнай культуры, адначасова адпавядае форме і зместу фальклору беларусаў.*

*Jauhen Lojka*

## HOLIDAY-COMPLEX DRAFT «BELARUSIANS' FEST CIRCLE»

*The author describes a project of a fest mass forming using reconstruction, restorations and transformations of folk rituals, which fully demonstrates beauty of traditional fest culture, at the same time corresponds to the form and content of the Belarusian folklore.*

Сённяшні стан святочнай культуры беларусаў шмат у чым абумоўлены трансфармацыямі афіцыйнай ідэалогіі ў XX ст.: у сталінскія часы пераследу падвяргаўся шэраг народных звычаяў і вераванняў; у часы «хрушчоўскай адлігі» культурная эліта гналася за асноўнымі мастацкімі трэндамі свету; у часы т.зв. «застою» была праведзена самавітая праца па акадэмізацыі і «акультурванні» фальклору; пакаленне 1990-х збольшага імкнулася актыўна пераймаць каштоўнасці заходняй культуры. У выніку, калі яшчэ ў пачатку XX ст. стойка фіксаваўся «аўтэнтычны» святочны народны каляндар беларусаў, то ў XXI ст. масавы глядач можа бачыць толькі трансфармацыю традыцый нашых продкаў. У той жа час трансфармацыя і мадэрнізацыя святаў знішчае культурную спадчыну нашых продкаў, скажае ідэйны змест і культурныя коды, закладзеныя ў тым ці іншым абрадавым свяце.

Грамадства на пачатку XXI ст. прагне айчыннага «культурнага прадукта»: сёння мы можам назіраць за працэсам «мяккай беларусізацыі» ў сацыяльным і культурным жыцці. Стаўленне да беларускай мовы і традыцый змяняецца, мова атрымлівае статус «элітарнай». Мы можам бачыць гэта ў тым, як буйныя кампаніі і СМІ выкарыстоўваюць этніку для стварэння рэкламы: шэраг брэндаў паспяхова спрабуе прасоўваць на рынку тавары з традыцыйнай беларускай сімволікай; сусветныя бэстсэлеры перакладаюць на родную мову; артысты беларускай эстрады (як найзапатрабаванай часткі масавай культуры) усё часцей ствараюць свае творы ў этнічным каларыце, нават сабраліся прадставіць беларускамоўную песню на інтэрнацыянальным па канцэпцыі «Еўрабачанні-2017». Не дзіўна, што ў святочнай культуры мы заўважаем цікавасць гледача да традыцыйных абрадавых формаў.

Існуе чатыры формы захавання і развіцця традыцыйнай беларускай святочнай культуры: 1) рэстаўрацыя – аднаўленне арыгінальнага стану абрадаў у іх натуральным асяроддзі; 2) рэканструкцыя – аднаўленне першапачатковага стану з выкарыстаннем сучасных тэхналогій; 3) трансфармацыя – перанос святаў і абрадаў у ненатуральнае асяроддзе (на сцэну) з выкарыстаннем сучасных тэхналогій; 4) новае святочнае формаўтварэнне – вялікая святочная форма з мноствам маленькіх формаў (фэсты). Кожная з іх патрабуе дэталёвай прапрацоўкі з боку мэнэджменту і навуковай дзейнасці.

Святы – яркія падзеі ў жыцці беларусаў. Спалучаючы розныя віды мастацтва, яны аказваюць вялікі ўплыў на пачуцці і свядомасць людзей, многія з іх дагэтуль стабільна вабяць вялізнае кола гледачоў. Таму я прапаную стварыць праект у форме новага святочнага формаўтварэння (з выкарыстаннем рэкансрукцый, рэтаўрацый і трансфармацый), якое ў поўнай меры дэманструе прыгажосць беларускай святочнай культуры, дзе, згодна абрадавым умовам, адсутнічаюць гледачы, якія, пераступіўшы мяжу тэрыторыі правядзення мерапрыемства, становяцца саўдзельнікамі.

За адзін каляндарны год праектам запланавана каля 20 народных святаў. Напрыканцы святочнага календара будзе арганізавана святочна-масавае дзеянне, якое прэзентуе ўсе святы адначасова. Такім чынам, «Святочнае кола беларусаў» уяўляе сабой комплексную прэзентацыю святочнай культуры беларусаў. З цягам часу, гэта мерапрыемства можа набыць фэставую форму і задзейнічаць усе мастацкія калектывы народнай песні і танца Рэспублікі Беларусь. На базе яго можна праводзіць разнастайныя міжнародныя, рэспубліканскія і гарадскія імпрэзы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праект разлічаны такім чынам, каб з кожным правядзеннем буйнога свята «Святочнае кола беларусаў», пакідаў пасля сябе этнаграфічныя будынкі, у выніку чаго яго пляцоўка ператваралася б у невялічкую вёску, у якой кожны з жадаючых можа зняць у арэнду створаныя самімі ж гледачамі будынкі. Праз некалькі гадоў плануецца мець на тэрыторыі каля 30 хатак памерам 4х5 м., дзе ўнутранае аздабленне нагадвае інтэр'ер беларускай хаты. Санітарны вузел будзе пабудаваны да правядзення першага свята і будзе знаходзіцца за 70 метраў ад правядзення асноўнага дзеяння. У далейшым гэта сэканоміць выдаткі на арэнду мабільных біяпрыбіральняў. Паступова тэрыторыя будзе атрымліваць буйную інфраструктуру, якую можна выкарыстоўваць для каравайнераў, ці стварыць агра-турыстычны комплекс.

Навізна праекта складаецца ў адначасовай прэзентацыі ўсіх святаў беларускага народнага календара, якае ўключае ў сябе як форму трансфармацыі, так і рэканструкцыю.

Месцам правядзення свята мяркуецца Аўгустоўскі канал як прыдатнае месца для адпачынку, якое прываблівае турыстаў з усяго свету не толькі сваёй прыродай і прыгажосцю, але і непаўторнай унікальнасцю гідратэхнічных збудаванняў. Дзякуючы беларуска-польскай дамове ад 2005 г. пра рэканструкцыю канала, цяпер шлюзы зноў прымаюць судны. Плануецца, што хутка на карце з'явяцца порты, кемпінгі, гасцініцы.

Час правядзення свята плануецца на жнівень-верасень – месяцы, найбольш аптымальныя для правядзення пленэрных імпрэз, бо надвор'е застаецца цёплым. Гэтак жа такое надвор'е набліжае да арыгінальнага часу правядзення кірмашоў і святаў ураджаю, святаў вяснова-летняга цыклу (за выключэннем святаў зімовага цыклу).

У мэтах стварэння перадсвяточнай атмасферы, актывізацыі шырокага кола насельніцтва, распрацоўваецца шэраг мерапрыемстваў, у выніку якіх людзям даецца магчымасць акунуцца ў цудоўны свет старажытнай беларускай святочнай культуры. Напярэдадні свята горад правядзе шэраг мерапрыемстваў: правядзенне рэкрамных акцый, конкурсаў і выстаў.

Для правядзення праекта плануецца прыцягненне спонсарскіх і партнёрскіх сродкаў, а таксама аказанне сямейна-пабытавых паслуг. Што да апошняга, маецца на ўвазе рэалізацыя замовы на правядзенне беларускага народнага вяселля з усімі рытуаламі і абрадамі. Спонсарскія сродкі спатрэбяцца для стварэння прызавога фонду ў 36.000 BYN, які будзе перададзены пераможце конкурсу прафесійных і аматарскіх калектываў беларускай народнай песні і танца. Мяркуецца ажыятаж ва ўдзеле (парадку 30 калектываў), якія ў плыні ўсяго мерапрыемства возьмуць удзел у кожным з прысвяткаў, чым створаць музычна-гукавое і пластычнае афармленне свята. У якасці журы конкурсу выступяць самі гледачы, якія змогуць адправіць SMS з нумарам упадабанага выканаўцы. За SMS будзе спаганяцца плата, што таксама пакрые частка выдаткаў. Уваход на тэрыторыю святаў упрыгожанс сімволікай «Святочнае кола беларусаў», дзе кожны апрымлівае стылізацыю беларускага нацыянальнага строя, пасля чаго аплочвае удзел у свяце 10 BYN.

*Мастацкі вобраз свята* адлюстраваны ў трох напрамках: музычны вобраз уяўляе сабой беларускія народныя творы кожнага свята ў жывым выкананні прафесійных і аматарскіх калектываў; у пластычным вырашэнні прадстаўлены абрадавыя дзеі кожнага свята; дэкаратыўна-прыкладны вобраз складаецца з улікам асноўнай беларускай каларыстыкі. Сімволікай свята з’яўляецца «сонца», якое ўяўляе кола года асноўнай думкай: «Усе мы пад адным небам». Кожны з пялёсткаў сонца мае свой колер, што сімвалізуе беларускія святы.

***Непасрэдныя мэты праекта:*** удасканаленне сацыяльных, арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый развіцця культуры і мастацтва і стварэнне неабходных умоў для даступнасці для грамадзян нацыянальнай культурнай спадчыны; стварэнне развітай інфрастуктуры комплексу «Святочнае кола беларусаў»; стварэнне ініцыятыўнай групы; рэалізацыя патэнцыялу Аўгустоўскага канала; стварэнне крэатыўнай прасторы; прыцягненне замежных турыстаў (арыентыравана грамадзян Літвы, Латвіі, Расіі і Польшчы).

***Перспектыўная мэта праекта:*** стварэнне комплексу традыцыйнай беларускай культуры на тэрыторыі Аўгустоускага канала. На базе комплексу прадугледжваецца рэгулярнае правядзенне масавых беларускіх народных святаў, якія накіраваны на адраджэнне захаванне і развіццё традыцыйнай беларускай культуры. Асноўнае свята «Святочнае кола беларусаў» будзе складацца з усіх святочных дзеянняў, якія праходзяць у плыні беларускага народнага календара. Комплекс будзе ўладкоўвацца і пашырацца па меры штогадовага правядзення, акрамя таго, тэрыторыя будзе знаходзіцца ў сталай святочнай атмасферы. Гэта дазволіць стварыць развітую інфраструктуру ўсёй тэрыторыі комплексу, у склад якога ўвойдуць: гасцёвыя хаты для пражывання турыстаў; рэстаран беларускай кухні; лазня; арганізаваная пляжная зона; харчовая крама; хаткі барбекю; арганізаваная аўтастаянка; ландшафтны дызайн і насаджэнні ў выглядзе пладовых і іглічных дрэў; крэатыўная пляцоўка.

Праект карысны для грамадства таму, што падрыхтоўка і правядзенне святаў і забаў служаць маральнаму выхаванню грамадзян: яны аб'ядноўваюцца агульнымі перажываннямі, у іх выхоўваюцца асновы калектывізму; творы фальклору, песні і вершы пра Радзіму, пра родную прыроду, працы фарміруюць патрыятычныя пачуцці; удзел у святах і гульнях фарміруе ў людзях дысцыплінаванасць, культуру паводзінаў. Развучваючы песні, вершы, танцы, людзі пазнаюць шмат новага пра сваю краіну, прыроду, пра духоўную і матэрыяльную культуру нашай краіны. Гэта пашырае іх далягляд, развівае памяць, гаворку, уяўленне, спрыяе разумоваму развіццю, складнікі фальклору «ахоўваюць псіхічнае і фізічнае здароўе чалавека, бароняць яго ад стрэсаў, адзіноты, канфліктаў з сабою і ўласным асяродкам» [1, с. 4].

**Спіс літаратуры:**

1. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Э. Дарашэвіч ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с.
2. Аддзенне «Honar» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.honar.by. – Дата доступа : 12.02.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ